УДК 316.48

**А.А. Спірына,**
*аспірант кафедры філасофіі і культуралогіі БДУКіМ*

# МІЖГРУПАВЫ КАНФЛІКТ: АБ'ЕКТЫЎНЫЯ І СУБ'ЕКТЫЎНЫЯ ФАКТАРЫ ЯГО ЎЗНІКНЕННЯ

Сучасным працэсам глабалізацыі спадарожнічае пашырэнне міграцыйных плыней. Так, штогод у краіны Еўрапейскага саюза (ЕС) праз розныя нелегальныя каналы заязджаюць каля паўмільёна мігрантаў, пры гэтым не бяруцца пад увагу 400 тыс. чалавек у год, якія афіцыйна шукаюць прытулку на еўрапейскім кантыненце [6, с. 44]. Таму сёння на першы план вылучаюць дзве асноўныя праблемы: 1) як тытульнай групе не страціць здольнасць да захавання ўласнай ідэнтычнасці і не стаць толькі адной з разнастайных груп у мультыкультурным грамадстве; 2) як культурнай групе абараніць свае інтарэсы, звязаныя з захаваннем сваёй ідэнтычнасці на іншароднай тэрыторыі. Супадзенне або несупадзенне такога кшталту living рознабаковых інтарэсаў і нежаданне знайсці кансэнсус спараджае канфліктныя ўзаемадзеянні культурных групп: груп-мігрантаў, з аднаго боку, і тытульнай групы – з іншага.

У аснове ўзнікнення канфлікту ляжаць супярэчнасці (паміж асобнымі індывідамі, іх групамі, дзяржавамі і г. д.). Л. Козер правамерна адзначаў, што «сацыяльны канфлікт можна вызначыць як барацьбу каштоўнасцей, замахі на вызначаны грамадскі статус, уладу і абмежаваныя рэсурсы, калі мэты канфліктуючых бакоў складаюцца не толькі з імкнення валодаць жаданай каштоўнасцю, але і нейтралізаваць, прычыніць шкоду або ліквідаваць саперніка» [5, с. 8].

***Міжгрупавы канфлікт – гэта абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей, якія выяўляецца ў шматстайных формах барацьбы паміж рознымі сацыяльнымі супольнасцямі і накіраваны на дасягненне эканамічных, сацыяльных, палітычных, духоўных і іншых інтарэсаў праз нейтралізацыю або ліквідацыю саперніка (сапраўднага або ўяўнага), які не дазваляе дамагчыся іх рэалізацыі. Такім чынам*, міжгрупавы канфлікт** – гэта актыўная барацьба, накіраваная на задавальненне інтарэсаў уласнай групы. Пабочны, але ад гэтага не менш значны вынік канфлікту – дасягненне групавой згуртаванасці на аснове агульнай барацьбы з сапернікам (менавіта такую выснову робіць Н. Смэлзер на аснове аналізу паводзін гарадскіх банд у Чыкага і іншых буйных гарадах ЗША) [4]. У адпаведнасці з вышэйадзначаным, галоўная функцыя міжгрупавых канфліктаў – абарона групы як цэласнай аўтаномнай адзінкі. Акрамя гэтай можна вылучыць і шэраг іншых:

1) *функцыя стымулятара.* Канфлікт здольны прывесці да хуткіх і глыбокіх змен у сацыяльна-эканамічнай і духоўнай сферах грамадства (напрыклад, у Румыніі ў выніку доўгага канфлікту паміж венграмі і тытульнай групай у 1996 г. была падпісана румына-венгерская дамова, па якой венгры ў Цімішоры атрымалі права выкарыстоўваць сваю родную мову ў мясцовых установах) [3, с. 3–5.];

2) *дэзынтэграцыйная функцыя*, якая азначае выхад індывідаў з вызначаных сацыяльных структур, што можа прывесці да распаду сацыяльнай сістэмы (напрыклад, «самагетаізацыя» культурных груп на іншароднай тэрыторыі);

3) *дэструктыўная функцыя.* Канфлікт аказвае разбуральнае ўздзеянне на групы, паміж якімі ён разгортваецца (напрыклад, вайсковыя дзеянні, якія могуць прывесці да частковага або поўнага знішчэння групы);

4) *сігнальная функцыя*. Наяўнасць канфлікту сведчыць аб няшчасці ў той або іншай сферы грамадскага жыцця вызначанай культурнай групы (рэлігійныя, палітычныя, этнакультурныя канфлікты паміж тытульнай і культурнымі групамі).

На наш погляд, асноўнымі прычынамі ўзнікнення канфліктаў з'яўляюцца: абмежаванасць матэрыяльных і духоўных рэсурсаў; сацыяльнае і маёмаснае расслаенне грамадства; ушчэмленасць адной сацыяльнай групы з боку іншай у сацыяльным, эканамічным, палітычным і іншых аспектах; адрозненне сацыяльна-палітычных пазіцый; этнакультурныя адрозненні. Такім чынам, міжгрупавыя канфлікты дэтэрмінаваны няроўнасцю ў размеркаванні матэрыяльных і духоўных выгод і ў цэлым статусам, які займае група на вызначанай тэрыторыі. І чым больш немаёмасныя групы сумняваюцца ў справядлівасці размеркавання ў дадзенай сацыяльнай сістэме, тым больш верагодней фарміраванне ў сістэме патэнцыялу напружанасці. Яго асновай з'яўляюцца групавыя інтарэсы па змене сітуацыі, якая склалася ў гэты момант. Схему ўзнікнення патэнцыялу напру-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жанасці можна прадставіць у наступным выглядзе: ***групавыя інтарэсы > групавыя чаканні > міжгрупавыя супярэчнасці > патэнцыял напружанасці.***

Падчас фарміравання патэнцыялу напружанасці ў сацыяльнай сістэме групавыя інтарэсы пераходзяць у «рэжым» групавых чаканняў. Апошнія, у выніку немагчымасці іх задавальнення, прыводзяць да ўзнікнення міжгрупавых супярэчнасцей (інтарэсы адных груп сутыкаюцца з інтарэсамі іншых). Сукупнасць такіх супярэчнасцей, іх скіраванасць і вастрыня праявы ў групавых чаканнях, пазіцыі груп складаюць патэнцыял напружанасці. Напрыклад, на працягу апошніх некалькіх гадоў сістэма сацыяльнага забеспячэння ў ЗША паступова ператвараецца са сродку дапамогі маламаёмасным у прыладу рашэння праблем мігрантаў: каля 60 % выдаткаваных на гэтыя мэты сродкаў накіроўваецца на падтрымку прыезджых, пры гэтым колькасць сем'яў афра- і лацінаамерыканцаў, змешчаных за рысай беднаты, толькі расце (у 2006 г. гэты паказчык складаў 27,5 %, у лацінаамерыканцаў – 26,4 %) [8, с. 445]. Адчуванне няшчасця, звязанае з міграцыяй, атрымала адлюстраванне ў СМІ: у друкаваных выданнях і ў тэлевізійных праграмах актыўна выступалі за паніжэнне квот і сацыяльных дапамог для мігрантаў [7, с. 536–537]. Гэту стадыю фарміравання канфлікту мы назавём ***латэнтнай.*** Але каб канфлікт узнік, як правіла, мала толькі патэнцыяльнай напружанасці. Неабходнае ператварэнне ў напружанасць рэальную, гэта значыць усведамленне прадмета канфлікту яго ўдзельнікамі. Гэты працэс характарызуецца ператварэннем ушчэмленай групы ў суб'ект канфлікту, які здольны ініцыіраваць канфліктную сітуацыю праз пэўныя дзеянні. Такім чынам, узнікненне канфліктнай сітуацыі можна прадставіць у наступным выглядзе: ***патэнцыял напружанасці > суб'ект канфлікту > канфліктная сітуацыя.***

Такім чынам, суб'ект канфліктнай сітуацыі фарміруецца тады, калі групай усвядомлены або хоць бы адчуты рэальны факт недахопу важнага (жыццёвага або сімвалічнага) рэсурсу, які складае аб'ект канфлікту. Гэту стадыю фарміравання канфлікту назавём ***актуальнай.*** Яна завяршаецца інцыдэнтам, які ўвасабляе наступленне адкрытай барацьбы за ўладанне аб'ектам (каштоўнасцю, выгадай). Такім чынам, у выніку перарастання патэнцыяльнай напружанасці ў рэальную, а таксама пераходу з латэнтнай у актуальную стадыю фарміруецца канфліктная група, г. зн. суб'ект канфліктнага дзеяння, які ініцыіруе ўзнікненне канфліктнай сітуацыі. Вяртаючыся да вышэйпрыведзенага прыкладу, адзначым, што выступленне грамадскага дзеяча У. Сміта з прапановай аб двухразовым скарачэнні іміграцыі паслужыла падставай для вулічных беспарадкаў, арганізатарамі якіх сталі студэнты, што прадстаўляюць розныя культурныя групы [7, с. 536–537].

Падагульніўшы вышэйпададзенае, мы прапануем наступную мадэль канфлікту як працэсу: ***групавыя інтарэсы > міжгрупавыя супярэчнасці > патэнцыял напружанасці > інцыдэнт > канфліктнае ўзаемадзеянне.***

Гэта мадэль дэманструе, што асноўнымі аб'ектыўнымі фактарамі, якія прадвызначаюць узнікненне канфліктнай сітуацыі, з'яўляюцца групавыя інтарэсы. Аднак пры разглядзе прыроды канфлікту значная ўвага надаецца і суб'ектыўным фактарам. Яны звязаны з усвядомленымі або неўсвядомленымі эмацыянальнымі, валявымі і іншымі суб'ектыўна афарбаванымі дзеяннямі людзей. Само ўсведамленне няроўнасці, несправядлівасці суправаджаецца больш або менш інтэнсіўным усплёскам эмоцый, якія напластоўваюцца на рацыянальныя кампаненты самасвядомасці груп і становяцца дэтанатарам фарміравання канфліктных груп, дзеянні якіх абвастраюць аб'ектыўна ўзнікшую канфліктную сітуацыю. І чым больш выразным становіцца эмацыянальнае азначэнне кожнай з канфліктных груп сваіх меж (па прынцыпе «свой – чужы»), тым верагодней узнікненне канфлікту. Таму ён звычайна прымае форму аб'ект-суб'ектных адносін, дзе пускавым механізмам аказваецца высокі ўзровень эмацыянальнага ўзбуджэння. Яго аснова – пачуццё непрыязнасці і іншыя праявы ў стаўленні да Іншых, спароджаныя групавымі стэрэатыпамі. Менавіта эмацыянальная афарбоўка і ацэначны характар стэрэатыпаў адыгрывае важную ролю ў фарміраванні міжгрупавых стасункаў. Суб'ектыўны кампанент вызначае глыбіню, працягласць і ў цэлым спецыфіку канфліктнай сітуацыі: чым больш адмоўнае стаўленне да іншай групы, тым больш агрэсіўны характар набывае канфлікт.

Стэрэатыпы ў большасці выпадкаў носяць нейтральны характар, аднак пры праецыраванні на пэўную групу (сацыяльную, рэлігійную, этнічную, расавую і г. д.) часта набываюць пазітыўнае або негатыўнае адценне. Пазітыўны стэрэатып узнікае ў тым выпадку, калі дзве групы ўтрымоўваюць значную колькасць рыс агульнай культуры (падабенства групавых карцін свету), і іх розныя рысы не перашкаджаюць узаемаадносінам, а палітычныя стасункі паміж імі носяць добразычлівы і канструктыўны характар. У гэтым выпадку адбываецца супастаўленне асноўных прыкмет гэтых груп і адначасова пабудова ўзаемадапаўняльных выяў. У ідэальнай сітуацыі ўзаемаадносін гэтыя выявы набываюць характар малых, або *лакальных, «мы-вобразаў»*, у якасці фону якія прадугледжваюць вялікі, або *надлакальны, «мы-вобраз»* (французы і італьянцы як лакальныя этнанацыянальныя выявы ў складзе надлакальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цывілізацыйнай выявы еўрапейцаў). Актуалізацыя станоўчага групавога стэрэатыпу, а менавіта ўсведамленне і прыняцце асаблівасцей груп, – першы крок на шляху міжкультурнага разумення. Змяніць стэрэатыпы надзвычай складана, аднак мы лічым, што дзякуючы фарміраванню талерантнага стаўлення да прадстаўнікоў іншых культур магчыма перавесці іх з разраду «адмоўных» у разрад «станоўчых». Нездарма Л. Джасім і К. Маколі назвалі станоўчы стэрэатып «адчувальнасцю да шматстатнасці» або «культурным усведамленнем у мультыкультурным свеце» [2, с. 479].

Іншая справа негатыўны стэрэатып, таму што менавіта на ім заснаваны такія з'явы, як расізм, сексізм, ісламафобія, еўропафобія і іншыя ксенафобіі. Разгледзім найбольш падрабязна развіццё негатыўнага стэрэатыпу як суб'ектыўнага фактару канфлікту. Спачатку вылучаецца самая незвычайная прыкмета, якая адносіцца да розных аспектаў выявы жыцця групы. Калі адзначаная прыкмета пагаршаецца, то гэта прыводзіць да перарастання стэрэатыпу ў прадузятасць, а затым, атрымаўшы эмацыянальную афарбоўку, у забабоннасць, што часта вядзе да этнацэнтрызму. **Этнацэнтрызм** – гэта такое «бачанне рэчаў, пры якім свая група становіцца ў цэнтры ўсяго, а іншыя сувымяраюцца з ёй або адзначаюцца са спасылкай на яе» [1, с. 41]. Такім чынам, этнацэнтрызм – гэта схільнасць успрымаць усе жыццёвыя з'явы скрозь прызму «сваёй» групавой карціны свету. Пры гэтым сама група разглядаецца як ідэал, узор для пераймання. Адным з асноўных паказчыкаў этнацэнтрызму з'яўляецца ўспрыманне элементаў групавой карціны свету як правільных, а іншых – як «няправільных», а значыць «чужых». Такім чынам, у групавой свядомасці з'яўляецца «вобраз ворага», які надае канфліктнай сітуацыі больш разлютаваны характар, што часта прыводзіць да эскалацыі вайсковых дзеянняў. Вядома, што ў выпадку, калі стэрэатып, які прадвызначае паводзіны прадстаўнікоў культурнай групы, актуалізуецца ў канфліктнай сітуацыі, ён заўсёды будзе асноўным пры выбары спосабаў уздзеяння канфліктуючага на групу.

Ва ўмовах нестабільнага, крызіснага стану грамадства групавы стэрэатып успрымання прадстаўнікоў культурнай групы трансфармуецца. У такой сітуацыі індывідуальныя прыкметы (рысы характару, дзелавыя якасці, асаблівасці веравызнання і г. д.), уласцівыя індывіду, адыходзяць на задні план, зацямняюцца, адціскаюцца стэрэатыпічнымі адзнакамі яго групы. Прычым менавіта гэтыя абагульненыя, часцей за ўсё злучаныя з негатыўнымі адзнакамі і непрыязным успрыманнем, прыкметы становяцца сродкамі арыентацыі ў міжгрупавым узаемадзеянні. І як вынік, уся група пачынае ўспрымацца як адзіны сацыяльны суб'ект, у стаўленні якога пад уплывам адпаведнай крызіснай сітуацыі ўтвараюцца варожыя атрыбуцыі («прыгнятальнікі», «сепаратысты»). Распаўсюджанасць і інтэнсіўнасць такіх групавых гетэрастэрэатыпаў вышэй за тыя, што заснаваны на непасрэдным міжасобасным успрыманні, паколькі апошнія знаходзяцца ў межах індывідуальнага досведу асобных людзей, і гэта перашкаджае фарміраванню крайніх пазіцый і іх распаўсюджванню. Групавы гетэрастэрэатып успрымання культурнай групы набывае ў такіх умовах рысы рэзка выяўленага групацэнтрызму (этнацэнтрызму), што праяўляецца ў негатыўнай рэакцыі на любыя праявы асаблівасцей, традыцый, абрадаў, жыццёвых установак іншага. Тым самым ствараецца эмацыянальна насычаная, а таму і магутна дзейнасная сацыяльна-псіхалагічная прастора ўзнікнення міжгрупавой канфліктнай сітуацыі.

Падагульніўшы вышэйсказанае, можна зрабіць наступныя высновы:

1. Негатыўныя групавыя стэрэатыпы з'яўляюцца суб'ектыўным фактарам узнікнення канфліктаў, які ўплывае на іх характар, глыбіню і працягласць.

2. Групавыя стэрэатыпы пераходзяць у статус негатыўных пры ўзнікненні напружанасці ў адносінах паміж групамі.

3. Стэрэатыпы могуць змяняцца (пераходзіць у статус пазітыўных) у залежнасці ад сацыяльных, палітычных і эканамічных перадумоў, аднак працэс гэты адбываецца вельмі павольна. У выніку можна пабудаваць мадэль міжгрупавога канфлікту (рысунак).

Такім чынам, міжгрупавы канфлікт – гэта цэласны працэс, аснову якога складаюць аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары, што прадвызначаюць яго асаблівасці праходжання (вастрыню і працягласць). Пры гэтым, калі аб'ектыўны фактар абумоўлены сутыкненнем процілеглых інтарэсаў, то суб'ектыўны дэтэрмінаваны асаблівасцямі групавой карціны свету, а менавіта спароджанымі ёю ўстаноўкамі, стэрэатыпамі, прадузятасцямі і г. д. (суб'ектам канфлікту можа быць як культурная група, так і тытульная супольнасць). Таму мы лічым, што сучасныя мадэлі міграцыйных палітык (асіміляцыя і сегрэгацыя) – бесперспектыўныя, паколькі пры асіміляцыі суб'ектам канфлікту будзе выступаць культурная група, якая прыйшла на тэрыторыю краіны, а пры сегрэгацыі – тытульная




***Рысунак*** **– Мадэль міжгрупавога канфлікту**

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

група. Аднак, на наш погляд, існуе рэальная магчымасць вырашэння і ўрэгулявання міжгрупавых канфліктаў дзякуючы мадэлі мультыкультуралізму, якая робіць акцэнт на міжгрупавой сацыяльнай салідарнасці. Гэта мадэль мяркуе пошук агульных кропак судакранання інтарэсаў, дасягнення кампрамісу, згоды па пытаннях, якія маюць актуальнае значэнне для абодвух бакоў, уцягнутых у канфліктны працэс, а таксама спрыяе пераадоленню групавых стэрэатыпаў.


ЛІТАРАТУРА

1. *Белик, А.А.* Культурология: Антропологические теории культур / А.А. Белик. – М.: РГГУ, 1999. – 241 с.
2. *Майерс, Д.* Социальная психология / Д. Майерс. – СПб.: Питер, 2007. – 794 с.
3. *Помогайбо, Р.И.* Языковая ситуация в мире (по материалам зарубежной печати) / Р.И. Помогайбо // Неродные языки в учебных заведениях: материалы науч. конф. кафедр иностр. и русского языков. Вып. 3. – Воронеж: Воронежский гос. архит.-строит. акад., 1998. – С. 3–5.
4. *Фрейд, З.* Психоанализ. Религия. Культура / З. Фрейд. – М., 1992.
5. *Coser, L.* The Function of Social Conflict / L. Coser. – London, 1956. – 364 p.
6. *Geddens, A.* Immigration and European Integration: Towsrds Fortess Europe? / A. Geddens. – Manchester: Manchester Univ. Press, 2000. – P. 44.
7. *Easterlin, E.A.* Twentieth-Century American Population Growth in The Cambridge Economic History of the United States / E.A. Easterlin. – Cambridge: Cambridge Univ. Press, 2000. – P. 536–537.
8. Statistical Abstract of the United States 2001, Washington (DC): U.S. Census Bureau, 2001, table 5, p. 445.



SUMMARY

*The author offers his own model of intergroup conflict. In conclusion on the basis of the received results he defined the definition of concept «intergroup conflict».*


---

*УДК 32.01*


***Н.В. Скок,***

*кандыдат палітычных навук, дацэнт, загадчык кафедры «Гуманітарныя дысцыпліны» Беларуска-Расійскага універсітэта (г. Магілёў)*


## КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ САЦЫЯЛЬНАГА КАПІТАЛУ РОБЕРТА ПАТНЭМА

На дадзены момант шырокае распаўсюджанне атрымала канцэпцыя сацыяльнага капіталу, якую можна трактаваць, у тым ліку, і як вынік развіцця тэорыі палітычнай культуры. Асаблівую ролю ў фарміраванні палітычнага дыскурсу аб сацыяльным капітале адыгралі даследаванні Роберта Патнэма. Менавіта ў яго працах – «Стварэнне дэмакратыі: традыцыі грамадзянскай актыўнасці ў сучаснай Італіі» і «Боўлінг на самоце: падзенне сацыяльнага капіталу Амерыкі» – набываюць сістэмнае палітыка-сацыялагічнае гучанне праблемы фарміравання сацыяльнага капіталу як умовы развіцця грамадзянскай палітычнай культуры.

У артыкуле робіцца спроба разглядзець асноўныя катэгорыі сучаснай тэорыі сацыяльнага капіталу скрозь прызму культуралагічнага падыходу, высветліць сувязь паміж сталым сацыяльным капіталам грамадства і магчымасцямі яго эфектыўнага эканамічнага і палітычнага развіцця.

Імклівая папулярызацыя тэорыі сацыяльнага капіталу абумоўлена шэрагам эканамічных, сацыяльна-палітычных і культурных фактараў.

Па-першае, гэта ланцуг такіх сацыяльных змен у краінах Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі, як зніжэнне валанцёрскай актыўнасці грамадзян, тэндэнцыі індывідуалізму і каштоўнасна-нарматыўнага рэлятывізму, змены суаднясення вольнага часу і часу, што вылучаецца пад працоўную дзейнасць і г. д. Акрамя гэтага ў якасці фактараў можна вылучыць узрастанне мультыкультурнасці «заходніх» грамадстваў і, адначасова, усё большую іх дэпалітызацыю, распаўсюджанне палітычнага абсентэізму.

Па-другое, імклівы рост папулярнасці тэорыі сацыяльнага капіталу абумоўлены зрухам ад дзяржаўнай адказнасці за сацыяльную ахову насельніцтва да шматлікіх ніжэйшых узроўняў праз працэс перадачы дзяржавай сваіх паўнамоцтваў недзяржаўным іСтытутам. Тэорыя сацыяльнага капіталу разам з тым тлумачыць, якім чынам індывіды могуць дасягаць большага пры меншай інстытуцыянальнай падтрымцы. Такім чынам, цікавасць да сацыяльнага капіталу дакладна адпавядае крызісу этатызму і адыходу ад мадэлі дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту.

Хуткае развіццё канцэпцыі сацыяльнага капіталу ў наш час можна растлумачыць і тым, што яе ўкладальнікі ў даволі дакладнай форме вызначаюць эфектыўнае функцыянаванне сучаснага грамадства і эканомікі ў такіх паняццях, як давер, культура, сацыяльныя сеткі, дабрачынныя асацыяцыі, чалавечы капітал і г. д. Сёння гэта актуальна як ніколі, бо грамадская думка пераважна высока ацэньвае сацыяльныя адносіны, якія абумоўліваюць вертыкальную і гарызантальную мабільнасць індывіда. Усё гэта сведчыць пра тое, што канцэпцыя сацыяльнага капіталу інкарпарыруе ў сабе шэраг новых накі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ